# ЭВАЛЮЦЫЯ ВЫВУЧЭННЯ АСОБЫ ФРАНЦЫСКА АСІЗСКАГА Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ

**А. А. Рахоўская**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь, elenarahovskaya99@mail.ru

У артыкуле на прыкладзе некалькіх гістарычных прац разглядаецца трансфармацыя падыходаў даследчыкаў да вывучэння біяграфіі Святога Францыска Асізскага, заснавальніка ордэна францысканцаў, у перыяд з канца XIX ст. да сучаснасці. У якасці крыніц аўтар выкарыстоўвае знакавыя працы для англа- і рускамоўнай францысканскай гістарыяграфіі. Робяцца высновы аб эвалюцыі даследчыскай парадыгмы ад класічнай біяграфіі да вывучэння стварэння і функцыянавання вобраза Францыска ў грамадскай свядомасці з сярэднявечча да нашых дзён.

*Ключавыя слова*: францысканская гістарыяграфія; Францыск Асізскі; вобраз у гісторыі; біяграфія.

# ЭВОЛЮЦИЯ ИЗУЧЕНИЯ ЛИЧНОСТИ ФРАНЦИСКА АССИЗСКОГО В ИСТОРИОГРАФИИ КОНЦА XIX – НАЧАЛА XXI ВЕКА

**Е. А. Раховская**

Белорусский государственный университет, г. Минск, Беларусь, elenarahovskaya99@mail.ru

В статье на примере нескольких исторических трудов рассматривается трансформация подходов исследователей к изучению биографии святого Франциска Ассизского, основателя францисканского ордена, в период с конца XIX в. до современности. В качестве источников автор использует знаковые для англо- и русскоязычной францисканской историографии работы. Делаются выводы об эволюции исследовательской парадигмы от классической биографии к изучению создания и функционирования образа Франциска в общественном сознании со времен Средневековья до наших дней.

*Ключевые слова*: францисканская историография; Франциск Ассизский; образ в истории; биография.

# EVOLUTION OF RESEARCH OF THE PERSON OF ST. FRANCIS OF ASSISI IN HISTORIOGRAPHY OF LATE XIX – EARLY XXI CENT.

**A. Rahovskaya**

Belarusian State University, Minsk, Belarus, elenarahovskaya99@mail.ru

The article examines the transformation of researchers' approaches to studying the biography of St. Francis of Assisi (the founder of the Franciscan Order) in the period from the end of the XIX century to the present, using the example of several historical papers. The author uses prime papers for English- and Russian-speaking Franciscan historiography as sources. The conclusions are drawn on the evolution of the research paradigm from classical biographies to the study of the creation and functioning of the image of St. Francis in the public consciousness from the Middle Ages to the present.

*Keywords*: Franciscan historiography; Francis of Assisi; image in history; biography.

Францыск Асізскі сёння з'яўляецца адным з самых папулярных святых у масавай культуры. На бытавым узроўні пазнання гісторыі ў Св. Францыску бачаць першавесніка Рэнесанса, рэфарматара, сацыяліста, рамантычнага героя і нават экалагіста. Вобраз Францыска заўсёды быў прыцягальны сваёй неардынарнасцю: пра яго захоплена пісалі гісторыкі, філосафы, рэлігіязнаўцы, публіцысты, ён натхняў мастакоў і музыкантаў. Адсылкі на гісторыю Францыска з'яўляюцца ў творах сучасных пісьменнікаў – італьянскага Джані Д'элія, чэшскага Мілана Кундэры і беларускіх Людмілы Рублеўскай і Дануты Бічэль, і нават у рэп-выканаўцы Oxxxymiron-а. А такая значная асоба для ХХ ст., як М. Тэтчар сваю першую прамову ў якасці прэм'ер-міністра пачала з цытаты Францыска Асізскага.

Даследванні гісторыі францысканскага ордэна распачаліся с вывучэння асобы Святога Францыска і яго біяграфіі. Сярод прац такога тыпу выразна вылучаюцца два напрамкі. Першы напрамак зарадзіўся адразу пасля смерці святога ў выглядзе агіяграфічнага жанру, прадстаўнікі якога працягвалі прытрымлівацца рэлігійных прынцыпаў і ў ХХ ст. Напрыклад, у ХХ ст у межах агіяграфічнай традыцыі жыццяапісання Францыска з'явіліся працы М. Сціко і Ф. Рэаці [1; 2].

Прадстаўнікі ж другога напрамку імкнуліся пазбавіцца ад ранейшых стэрэатыпаў у інтэрпрэтацыі поглядаў на Францыска. Асаблівае месца сярод такіх прац заняло сачыненне пратэстанцкага пастара Поля Сабацье «Жыццё Францыска Асізскага», выдадзенае ў 1893 г. і перакладзенае ў 1895 г. на рускую мову [3]. Праца выклікала неадназначную рэакцыю грамадства, з аднаго боку, за яе Сабацье быў намініраваны на Нобелеўскую прэмію па літаратуры, а з другога, яна трапіла ў Індэкс забароненых кніг. Сабацье ўпершыню пры напісанні біяграфіі Францыска Асізскага надаў асаблівую ўвагу крыніцазнаўчаму боку даследавання і стварыў падрабязную класіфікацыю крыніц, на падставе якіх будаваў сваю працу. У прадмове да сваёй кнігі Сабацье выступіў з крытыкай пазітывісцкіх падыходаў да гісторыі, падкрэсліў немагчымасць поўнай дакладнасці гістарычных твораў, бо ў любым выпадку на іх адбіваецца аўтарскае «я». І тут жа выклаў сваё бачанне місіі гісторыка, напрыклад, гэтую працу Сабацье напісаў, каб чытач палюбіў Св. Францыска, гэтая акалічнасць і абумовіла тэндэнцыёзнасць вобраза Францыска ў дадзеным даследаванні (Францыск у Сабацье пакутнік, а яго жыццё – гэта драма асобы, якая знаходзіцца ў супярэчнасцях з грамадствам і самой сабой). Таксама вызначальнай для далейшага лёса жыццяапісанняў Францыска стала выказаная Полем Сабацье незадаволенасць працай сваіх папярэднікаў – «афіцыйных каталіцкіх гісторыкаў», якія, на яго думку, сваімі «ўпрыгожваннямі заставілі забыць сапраўднага Францыска». Гэтая ідэя была падхоплена наступнымі гісторыкамі і доўгі час біёграфы Францыска шукалі «сапраўдную асобу» пад шматлікімі рэлігійнымі інтэрпрытацыямі яго жыцця. Яшчэ адной навацыяй у даследаванні П. Сабацье была спроба прасачыць не толькі рэлігійныя, але і палітычныя аспекты францысканскага руху.

На скрыжаванні агіяграфічнага і навуковага падыходаў змяшчаецца нарыс аб Св. Францыску, напісаны публіцыстам Г.К.Чэстартанам у пачатку ХХ ст., у якім аўтар паспрабаваў сумясціць рэлігійнасць і рацыяналізм [4]. Мэтай Чэстартана было зрабіць жыццё Францыска зразумелым для «дапытлівага сучаснага чытача», таму ў сваім нарысе ён адлюстраваў шлях Францыска ад жыцця звычайнага чалавека да святасці.

Аўтар вызначыў актуальнасць свайго даследавання ў сацыяльным і маральным, а не рэлігійным плане, кажучы пра тое, што св. Францыск апярэдзіў многае, што ёсць добрага ў сучасным свеце. Аднак Чэстартан стварыў усё ж рамантызаваны вобраз святога, літаратар падкрэсліваў летуценнасць і наіўнасць

Францыска, праводзіў паралелі паміж ім і «высакароднымі рыцарамі». Такім чынам, Чэстартан стварыў «сучаснае жыціе» святога [5, с. 114–115].

У расійскай гістарыяграфіі ўсплёск цікавасці да фігуры Францыска назіраўся ў канецы XIX – пачатаку XX стст. у сувязі з выхадам працы Сабацье. Таму цалкам звычайна, што ў рабоце «Францыск Асізскі. Яго жыццё і грамадская дзейнасць» (1896 г.) рускай журналісткі Эміліі Кірылаўны Піменавай назіраецца ўплыў П. Сабацье. Праца напісана ў біяграфічным жанры і канцэнтруецца на постаці Францыска, яго характары і вытоках яго духоўнасці [6]. Уладзімір Іванавіч Гер'е ў больш навуковым творы «Францыск апостал галечы і любові» (1908 г.) засяроджваецца на аскетызме святога і спрабуе ўпісаць яго фігуру ў гістарычны кантэкст [7].

Вынік шматлікім даследванням аб Францыску ў класічным біяграфічным жанры падвяла праца Жака Ле Гофа «Святы Францыск Асізскі», выдадзеная ўпершыню на італьянскайй мове ў 1967 г., аднак на французскую мову яна была перакладзена толькі ў 1999 г., а на ангельскую ўвогуле ў 2004 г. Ле Гофф імкнуўся з дапамогай культуралагічнай метадалогіі на аснове крытычнага даследавання крыніц і гістарыяграфіі паказаць асобу Францыска ў сацыяльна-культурным кантэксце сярэдневечча [8].

У асобную групу можна вылучыць працы гісторыкаў сярэдзіны XIX – пачатку XX стст., якія разглядалі асобу Францыска ў кантэксце культуры Адраджэння. Навукоўцы, якія працавалі ў дадзеным рэчышчы, бачылі ў Св. Францыску рысы новага чалавека рэнесанснага тыпу. Так, Жуль Мішле ў сярэдзіне XIX ст. выказаў ідэю, згодна з якой пераход ад Сярэднявечча да Адраджэння ўвасабляецца ў Францыску. Гісторык разглядаў святога як асобу, якая ўвабрала ў сябе ўсе сацыяльныя і палітычныя супярэчнасці эпохі. Генрых Тодэ ўвогуле імкнуўся ўказаць на ролю святога Францыска ў працэсе секулярызацыі свядомасці і грамадства ў працы «Францыск Асізскі і пачатак рэнесанснага мастацтва ў Італіі» (1885 г.) [9, с. 52–53]. З гэтай плеяды якасна вылучаецца рускі гісторык Пётр Міхайлвіч Біцылі. У сваіх працах ён прыйшоў да высновы, што хоць «новая культура ў згорнутым выглядзе» ўжо праглядалася ў асобе Св. Францыска Асізскага, але сам святы не думаў ні аб якім «адраджэнні» і не шукаў новага шляху да Бога [9, с. 54].

Адыход ад класічнага жыццяапісання Францыска адлюстраваны ў працы Андрэ Вашэ «Францыск Асізскі: жыццё і па-за труннае жыццё сярэднявечнага святога» (2009 г., у перакладзе на ангельскую 2012 г.) [10]. Даследчык звярнуў увагу на «ласкутнасць» папярэдніх работ, у якіх гісторыкі не звярталі ўвагу на спецыфіку, кантэкст і мэты стварэння выкарыстаных імі агіяграфічных крыніц, з-за чаго, нават насуперак сваім жаданням «адшукаць сапраўднага Францыска», стваралі штучны вобраз Асізскага святога. Сам А. Вашэ ўвогуле ставіць пад сумніў магчымасць знайсці рэальнага Францыска пад усімі наслаеннямі гісторыі. Улічваючы гэтую акалічнасць, Вашэ робіць акцэнт на аналізе сачыненняў самога Францыска для раскрыцця яго асобы, а таксама асобна разглядае яго «замагільнае жыццё» – стварэнне і эвалюцыю вобраза святога ад сярэднявечча да нашых дзён. І такім чынам, аўтар закладае новы вектар у развіцці даслетванняў аб Францыске – даследванне не самога святога, але яго вобраза ў гісторыі.

Таксама з незвычайнага боку разглядаецца жыццё і дзейнасць Францыска ў кнізе прафесара канадскага ўніверсітэта Святога Францыска Ксаверыя Доны Трэмбінскі «Хвароба і ўлада: інваліднасць у жыцці і жыціях Францыска Асізскага». У гэтай працы 2020 г. аўтар падае жыццёвы вопыт святога праз прызму інваліднасці, яна імкнецца праілюстраваць, як хваробы стварылі перашкоды для

Францыска пры ажыццяўленні ўлады ў заснаваным ім ордэне і ўвогуле ў царкоўнай іерархіі [11].

У рускай гістарыяграфіі пераход ад класічнай біяграфіі Францыска да разгляду яго вобраза ў гісторыі зрабіла Энжэ Дусаева. У 2004 г. яна абараніла дысертацыю, дзе разгледзіла фарміраванне вобраза Францыска ў заходнееўрапейскай культуры, аднак толькі на прыкладзе «Вялікай Легенды» Банавентуры і цыкле фрэсак Джота [12].

Развіццё новага напрамаку ў даследваннях аб Францыску Асізскім працягваецца ў манаграфіі А. Каўцовай «Францысканскі ордэн: ад апостальскага руху да вучонай карпарацыі (Францыя, XIII ст.)» (2018 г.) [13]. Галоўная тэма працы – станаўленне ордэна як вучонай супольнасці і эвалюцыя адносін францысканства да навукі. Аднак у першай частцы манаграфіі «Набожная легенда аб Францыску Асізскім» Краўцова не спрабуе знайсці «сапраўднага» Францыска і нават не паказаць яго жыццё ў кантэксце эпохі, а разглядае стварэнне вобраза Францыска як сумы поглядаў аўтараў жыццяў святога. А. Краўцова параўноўвае адлюстраванне адных і тых жа падзей з біяграфіі Францыска ў яго жыццях, створаных рознымі аўтарамі ў розныя часы і на гэтай падставе праводзіць сувязі паміж зменай палітычнай кан'юктуры, тэалагічнымі спорамі ў ордэне і Каталіцкай царкве і трансфармацыямі вобраза святога.

Аднак у той жа час на рускамоўнай прасторы ў 2018 г. у серыі «Жизнь замечательных людей» выдаецца праца Ганны Вятлугінай «Франциск Ассизский», якая стаіць бліжэй да класічнай біяграфічнай парадыгмы, хоць уплыў трактовак А. Вашэ ў ёй таксама відавочны, але толькі на інтэрпрытацыю фактаў біяграфіі святога, а не на мэты даследвання [14]. Так, Г. Вятлугіна ўсё яшчэ разглядае менавіта «зямное жыццё» Францыска ў гістарычным кантэксце сярднявечча, на фоне шырокіх сацыяльных, палітычных і духоўных працэсаў з гісторыі Італіі другой паловы XII–XIII стст. Цікавасць і «свежасць» даследаванню надае зварот аўтаркі да метадаў псіхалогіі, засяроджванне ўвагі на сямейным асяроддзі будучага святога і пошук прычын яго духоўнага павароту менавіта ў дзяцінстве і выхаванні Францыска.

Такім чынам, на працягу XIX–XX стст. даследаванні жыцця Францыска Асізскага адбываліся ў рэчышчы класічнай біяграфіі. Францісканаведы даследвалі аспекты зямной дзейнасці святога, спрабавалі знайсці «сапраўднага» Францыска пад спецыфічнымі агіяграфіцнымі скажэннямі і ўпісаць яго постаць у гістарычны кантэкст эпохі, у якой ён жыў. У XXI ст. назіраецца адыход ад такіх прынцыпаў напісання біяграфій святога, ён шмат у чым абумоўлены вычарпанасцю класічнай біяграфічнай парадыгмы, бо як пісала Дона Трэмбінскі (аўтар жыццяапісання Францыска праз прызму інваліднасці): «Калі я сказала калегам-медыявістам, што пішу кнігу пра святога XIII ст. Францыска Асізскага, большасць застагнала і сказала: "Нам не патрэбна яшчэ адна кніга пра Францыск"» [11].

Сёння істотна новай перспектыўнай тэмай даследаванняў, якая вылучылася з біяграфіі, з'яўляецца так званае «пазатруннае жыццё» Францыска, то бок стварэнне, эвалюцыя і прычыны трансфармацый вобраза святога на працягу ад сярэднявечча да нашых дзён. А разам з гэтым і пашырэнне такога падыходу на даследванні ўсяго францысканскага ордэна, то бок вывучэнне яго рэпрэзентацыі ў грамадскай свядомасці ў розныя гістарычныя перыяды.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Стикко М.* Святой Франциск Ассизский. Милан : Христианская Россия, 1990.
2. *Реати Ф.* Франциск – учитель молитвы. М. : Издательство Францисканцев, 2000.
3. *Сабатье П.* Жизнь Франциска Ассизского. М. : Посредник, 1895.

4. *Честертон Г. К.* Святой Франциск Ассизский // Вечный человек. М.: Эксмо; СПб. : Мидгард, 2004. С. 7–102.
5. *Козырева М. А.* «Святой Франциск Ассизский» Г. К. Честертона. Жанровые особенности // Филология и культура. 2012. № 4 (30). С. 113–115.
6. *Пименова Э. К.* Франциск Ассизский. Его жизнь и общественная деятельность // Будда Шакьямуни. Конфуций. Мухаммед. Франциск Ассизский. 2-е изд. Челябинск : Урал, 1998. С. 237–319.
7. *Герье В. И.* Франциск. Апостол нищеты и любви. Биография Святого Франциска Ассизского. Изд. 3-е. М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2011.
8. *Le Goff J.* Saint Francis of Assisi. London & New York: Routlege, 2004.
9. *Курамшина Ю. В.* Франциск Ассизский и истоки Возрождения в творчестве П. М. Бицилли // Культура народов Причерноморья: научный журнал. 2009. № 164. С. 52–54.
10. *Vauchez A.* Francis of Assisi: the life and afterlife of a medieval saint. New Haven & London: Yale University press, 2012.
11. Cameron-McCarron Sh. New book examines Francis of Assisi through the lens of disability studies [Electronic resource] / Shelley Cameron-McCarron // Medievalists.net. – Mode of access: https://www.medievalists.net/2020/12/francis-of-assisi-disability-studies/. – Date of access: 05.10.2021.
12. *Дусаева Э. М.* Формирование образа Франциска Ассизского в Западноевропейской культуре XIII – н. XIV вв. («Legenda maior» Бонавентуры и цикл фресок Джотто в Верхней церкви Ассизи): автореф. дис. …канд. Культурологии: 24.00.01. М., 2004.
13. *Кравцова Е. С.* Францисканский орден: от апостольского движения к ученой корпорации (Франция, XIII в.). М.; СПб. : Центр гуманитарных инициатив, 2018.
14. *Ветлугина А. М.* Франциск Ассизский. М. : Молодая гвардия, 2018.

## УНИВЕРСИТЕТ И АНГЛИЙСКИЙ СРЕДНЕВЕКОВЫЙ ГОРОД: ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ И ВЛИЯНИЕ

**А. В. Бубенец**

Белорусский государственный университет, г. Минск, Беларусь, 62442426z@gmail.com

Средневековое общество положило начало многим уникальным процессам, которые имеют влияние на сегодняшнюю жизнь. Одним з таких явлений становится появление университетской корпорации, чей статус точно не определен по сей день. Однако ни одно из явлений нельзя рассматривать в разрыве существовавшей иерархической структурой, которым наиболее близким являлся город. В статье производится попытка анализа опыта трех английских университетов эпохи Средневековья и уже устоявшихся городских структур.

*Ключевые слова*: университет; Кембридж; Оксфорд; Нортхэмптон; средневековый город; школяры.

## UNIVERSITY AND MEDIEVAL ENGLISH TOWN: INTERACTION AND INFLUENCE

**A. Bubieniets**

Belarusian State University, Minsk, Belarus, 62442426z@gmail.com

Medieval society initiated many unique processes that have an impact on today's life. One such phenomenon is the emergence of a university corporation, whose status hasn’t been precisely determined to this day. However, none of the phenomena can be considered in discontinuity by the existing hierarchical structure, to which the city was the closest. The article attempts to analyze the experience of three English universities in the Middle Ages and already established urban structures.

*Keywords*: university; Cambridge; Oxford; Northampton; medieval city; scholars; authorities.